УДК 947.2:323.311

А.А. Дамарад, канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# ПРАВЕРКА ПРАВАМЕРНАСЦІ НАДАННЯ ШЛЯХЕЦКАЙ ГОДНАСЦІ ДВАРАНСКІМІ ДЭПУТАЦКІМІ СХОДАМІ ГЕРОЛЬДЫЯЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Асабліва важным у дзейнасці Дваранскіх Дэпутацкіх сходаў стала вызначэнне парадку дакументавання прыналежнасці да расійскага дваранства, паколькі шляхта беларускіх зямель павінна была пацвярджаць сваё шляхецтва ў імперыі менавіта па гэтых правілах. З часоў першага падзелу Рэчы Паспалітай шляхта пацвярджала сваё паходжанне ў земскіх судах, а з прыняццем у 1785 г. «Жалаваннай граматы дваранству» – у губернскіх вывадовых камісіях

У Расійскай імперыі напачатку пацвердзіць шляхецтва і тытулы было адносна прасцей, чым у адзначаных дзяржавах, у якіх іх польскія правінцыі з'яўляліся сапраўдным хінтэрландам. Наадварот, ў вялікай еўразійскай краіне прадстаўнікі новадалучаных заходніх земляў разглядаліся як «еўрапейцы» апрыёрна бо́льшыя за саміх рускіх. Пазней быў замацаваны парадак пацверджання іх тытулаў у расійскай Герольдыі. Для родаў, якія валодалі тытулам князя Свяшчэннай Рымскай імперыі, легітымізаваць яго ў Расіі можна было ці не аўтаматычна, паколькі ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам і значэннем ў Еўропе. Характарызуючы адносіны царскай адміністрацыі да шляхты беларускіх зямель, В. В. Швед справядліва адзначаў, што «палітыка ўсіх цароў ад Кацярыны II да Аляксандра I была прадваранскай падобна палітыцы імператараў Аўстрыі ці каралёў Прусіі. Дзяржаўныя апараты трох захопнікаў зусім не зачыняліся перад добра народжанымі новымі падданымі. Феадальным паняццям, якім пакланяліся не толькі Расія, але таксама Аўстрыя і Прусія, быў характэрны свойскі касмапалітызм, заснаваны на тым, што рыцарскі стан, як і манархі ўсіх краін адчуваюць сябе пэўным сатаварыствам» [1, с. 103].

Увогуле, у Дваранскіх дэпутацкіх сходах беларускіх,літоўскіх і ўкраінскіх губернях рашэнні па прызнанні ў шляхецкай годнасці прымаліся дастаткова паслядоўна. Грунтаваліся гэтыя рашэнні на прадстаўленых доказах.

У выключных выпадках асабістыя заслугі прадстаўнікоў пэўных беларускіх родаў перад расійскім ўладамі дазвалялі ім увайсці ў склад вышэйшай імперскай арыстакратыі. Так здарылася, у прыватнасці, з родам Святаполк-Мірскіх. Даследчыкі сыходзяцца на думцы, што

такое прызнанне адбылося дзякуючы набліжанасці сына Тамаша Тэафіла Яна Святаполк-Мірскага Дзмітрыя Іванавіча да манарха і ягоным заслугам у якасці вайскоўца.

Сам працэс прызнання тытулаў мог займаць працяглы тэрмін, цягнучыся не адно дзесяцігоддзе нават для прадстаўнікоў тытулаванай арыстакратыі.

Вайсковая служба стала ці не галоўным шляхам інтэграцыі арыстакратыі былой Рэчы Паспалітай у расійскае дваранства

Далёка не ўсе баронскія роды, якія жылі ў беларускіх губернях, адразу змаглі пацвердзіць свой тытул. Прызнанне баронскага тытула Аффенбергаў для зацягнулася амаль да першай сусветнай вайны. Падобная сітуацыя склалася з прызнаннем у Расійскай імперыі баронскага тытула роду Нолькен.

Велізарная колькасць дакументаў, што датычыліся шляхецкага пытання, літаральна засыпалі Віленскую губернскую канцылярыю. Гэтым можна патлумацыць марудную працу ў складанні спісаў асоб, якія канчаткова пацвердзілі сваё дваранскае паходжанне ў Герольдыі. Само па сабе прадастаўленне дакументаў аб шляхецкім паходжанні не заўсёды дазваляла атрымаць статус двараніна Расійскай імперыі. Прычым губернскаму дваранскаму сходу асобна прадпісвалася прадаставіць звесткі «в какой разряд поступил»[1, с. 103].Галоўнай перашкодай на шляху замацавання дваранскага статусу за суіскальнікамі з беларускіх губерняў стала адсутнасць ва ўласнасці ў такіх асоб зямлі альбо іншай нерухомай маёмасці.

Такім чынам, дзейнасць Дваранскіх дэпутацкіх сходаў, засяроджаная вакол вырашэння «шляхецкага пытання», была толькі першым крокам. Большасць такіх рашэнняў тармазіліся маруднасцю зацвярджэння іх у Герольдыі. Адпаведна, носьбіты шляхецкага звання вымушаны былі перадаваць у спадчыну не толькі багацце, але і неабходнасць чакання вырашэшшя свайго лёсу.

## ЛІТАРАТУРА

1. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772—1863) / В. В. Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 415 с.РГИА. Ф. 1343. – Оп. 36. – Д. 25868 «О дворянстве рода Утгофов».
2. Васильевич, С.А. Титулованные роды Российской Империи / С. А. Васильевич. – СПб., 1910. – 498 с.